НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Філіял «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору
імя Кандрата Крапівы»

# БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР

## МАТЭРЫЯЛЫ І ДАСЛЕДАВАННІ

*Зборнік навуковых прац*

Заснаваны ў 2014 годзе

**Выпуск 4**

Мінск
«Беларуская навука»
2017

УДК 398(=161.3)(082)

Зборнік змяшчае раздзелы: «Даследаванні», «Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас», «Беларускі фальклор у замежных публікацыях», «З Калекцыі фальклорных запісаў», «Матэрыялы палявых экспедыцый», «Фальклор беларусаў замежжа», «Рэцэнзіі», «Хроніка». Тэарэтычны блок адведзены перадусім этнолагам, якія ў сваіх доследах традыцыйнай культуры не абыходзяцца без фалькларыстычнага матэрыялу і метадалогіі. У рубрыцы «Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас» аглядаецца блок легендаў, прысвечаных плямам на месяцы. Публікуюцца ўнікальныя запісы, якія захоўваюцца ў архіве аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (запісы фальклору яўрэяў Беларусі; беларусаў Беласточчыны), а таксама матэрыялы з архіва Літаратурнага музея ў Тарту, сучасныя палявыя запісы з прыватных архіваў. Багата прадстаўлены фальклор беларусаў замежжа.

Зборнік разлічаны на фалькларыстаў, этнографаў, мовазнаўцаў, краязнаўцаў, а таксама ўсіх, хто цікавіцца народнай спадчынай.

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:

Т. В. Валодзіна (гал. рэд.), А. С. Ліс, А. Б. Мароз, В. М. Шарая, І. А. Швед

Р э д а к ц ы й н а я р а д а:

М. П. Антропаў, А. М. Боганева, Ю. І. Внуковіч, Я. І. Грыневіч, А. А. Гулак, Ю. А. Крашэніннікава, У. А. Лобач, С. В. Русецкі, С. І. Санько

Р э ц э н з е н т ы:

кандыдат філалагічных навук А. В. Цітавец,

кандыдат філалагічных навук Л. М. Салавей

© Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, 2017
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2017

УДК: 908(476)+726.825.2.03(476)

*ДЗМІТРЫЙ СКВАРЧЭЎСКІ*

Прысвячаецца светлай памяці
*Аляксея «Якуба» Лужынскага (1988–2015)*

# КАМЯНІ З ВЫЯВАЙ ЗНАКА Ў ВЫГЛЯДЗЕ ВОСІ З ПАЎСФЕРАЙ: ДА ПРАБЛЕМЫ ПАХОДЖАННЯ, АРЭАЛА, КЛАСІФІКАЦЫІ І ДАТАВАННЯ

Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь

Ключавыя словы: надмагіллі, сакральныя камяні, пахавальная сімволіка, пахавальны абрад, жальнікі, Полацкае княства.

Мэта артыкула – даследаванне камянёў з выявамі знака ў выглядзе шаста з паўсферай (і яго варыяцый). Камяні з гэтым знакам выразна вылучаюцца ў асобны тып помнікаў. Пераважная большасць дадзеных знакаў высечана на надмагільных камянях. Існуе меркаванне, што гэтая сімволіка на землях Беларусі можа сведчыць аб этнічнай або на ват рэлігійна-міфалагічнай спецыфіцы [Прохараў 2011, 81]. Між тым дагэтуль не былі зафіксаваны звесткі пра гэты знак у час палявых экспедыцый. Мы не ведаем, чаму высякалі менавіта гэты знак, як ён называўся, у які храналагічны перыяд ён выкарыстоўваўся, на якой тэрыторыі ён распаўсюджаны, які сэнс дадзенай сімволікі і т. п. У артыкуле зроблена спроба акрэсліць напрамкі вырашэння адзначаных праблем і адказаць на гэтыя пытанні.

Гісторыя вывучэння. Першым, хто звярнуў увагу на камяні з выявай шаста з паўсферай і ўвеў іх у навуковы зварот, быў геолаг Э. Ляўкоў. У сваёй вядомай кнізе «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны» (1992) ён пісаў: «Цэлая гру па камянёў з малюнкамі… ляжала ў вёсцы Стайкі Лагойскага раёна. На пляскатых гранях злёгку выцягнутых валуноў, кожны з якіх быў даўжынёю ў метр альбо крых у больш, бліжэй да іх краю выразна вылуча ліся крыжыкі, “канверты”, сонейкі і часта знак, падобны на лук са стралой ці чалавека (тут і далей вылучана мной – *Д. С.*). Памер фігуры ад 10 да 42 см. Калі яны з’явіліся, ніхто ў вёсцы не ведае, таму што паселішча вырасла тут на месцы ранейшай стаянкі дрывасекаў. Старыя жыхары прыгадалі, што падобныя малюнкі на валунах бачылі ва ўрочышчы Мачулішчы, якое знаходзіцца за паўтара кіламетра ад вёскі, непадалёк ад ракі Віліі. Прыкладна так і ж знак у форме лука са стрэламі пашанцавала знайсці і ў вёсцы Альшэва недалёка ад возера Свір, так што арэал распаўсюджвання падобных выяў значны. Не выключана, што гэтыя фігуры высякалі ў памяць аб памерлых, але магчыма і іншае тлумачэнне» [Ляўкоў 1992, 163–164].

Аднак трэба адзначыць, што яшчэ да з’яўлення гэтай кнігі ў 1984 г. выйшла публікацыя Г. Штыхава, у якой ён пісаў пра археалагічнае даследаванне камянёў у Стайках [Штыхов 1984, 377–378], але не вылучаў іх у асобную групу. У 1990 г. выйшла кніга літоўскага даследчыка Р. Матуліса, у якой ён апублікаваў выявы камянёў са знакамі ў выглядзе шаста з паўсферай з в. Стайкі Лагойскага р-на, в. Гудзеняты Іўеўскага р-на і в. Дуброўка (не пазначаны раён) [Matulis 1990, 137–138].

Тым не менш менавіта Э. Ляўкоў быў першым, хто выказаў меркаванне пра існаванне асобнай групы камянёў з дадзеным знакам, прызначэнне тэрыторыю распаўсюджвання і пра прызначэнне сімволікі. Выява гэтага знака ўпрыгожыла вокладку і форзац кнігі «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны». Больш за тое, знакі са стайкаўскіх камянёў былі высечаны і на надмагіллі даследчыка.

У 1993 г. выйшла калектыўная праца аўтараў Інстытута геалогіі, геахіміі і геафізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі «Ледавіковыя валуны Беларусі: Эксперыментальная база вывучэння валуноў». У апісанні зоны «Камень і чалавек» у складзе парка валуноў таксама ўзгадваецца пра гэты знак, калі гаворка ідзе пра камяні з в. Стайкі Лагойскага р-на і в. Альшэва Мядзельскага р-на. «Відарыс уяўляе сабой **Падобныя фігуры** … Гэтыя відарысы спецыялісты-гісторыкі супастаўляюць з аналагічнымі знакамі ў наваколлі Ноўгарада, якія ў сваю чаргу падобныя да наскальных малюнкаў, выяўленых у Швецыі. Шведскія вучоныя лічаць гэтыя знакі зробленымі ў трэцім тысячагоддзі да нашай эры» [Ледавіковыя 1993, 49]. Як бачна, аўтары яшчэ не прыйшлі да выкарыстання адзінага тэрміна ў дачыненні да разгляданага сімвала. Упершыню была зроблена спроба параўнаць яго з іншымі вядомымі знакамі і на гэтай падставе вызначыць час стварэння помнікаў. Відавочна, што ў якасці параўнання выкарыстоўваліся выявы на валуне Шчаглец (Щеглец) у ваколіцах в. Мытна Наўгародскай вобл. Расійскай Федэрацыі.

У наступнай калектыўнай акадэмічнай манаграфіі «Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі» (2011 г.) [Культавыя 2011] пра групу камянёў з выявамі шаста з паўсферай ужо нічога не было сказана, што выглядае даволі дзіўным, бо да гэтага часу ўжо з’явіўся шэраг публікацый А. Прохарава, якія прысвячаліся даследаванню паходжання і міфа-рытуальнай семантыкі камянёў з дадзеным знакам. Аднак у дадзенай манаграфіі маецца прамалёўка камянёў са знакамі каля в. Сцеберакі Вілейскага р-на, распавядаецца паданне пра гэтыя камяні.

Падрабязнае даследаванне А. Прохарава пачалося з вывучэння каменнага комплексу каля в. Сцеберакі [Прохоров 2003], пасля чаго на працягу 8 гадоў з’явіліся некалькі прац [Prokhorov 2007–2009; Prohorovs 2008; Прохараў 2011], якія дазволілі не толькі выразна сфармуляваць кірункі даследавання, але і даць першыя адказы на некаторыя пытанні.

Паводле гіпотэзы А. Прохарава, гэты знак сімвалізуе Сусветны слуп, звязаны з Палярнай зоркаю, які трымаў нябесную гару балцкай міфалогіі, а таксама пазначаў рух душы памерлага ў верхні нябесны свет. Першапачатко-

ва знак меў паганскае паходжанне, а пасля мог суадносіцца з выявай крыжа на Галгофе ды ідэяй узнясення. Падобныя святыя або надмагільныя камяні з выявай нябеснай сферы станавіліся элементам, які звязваў розныя светы, умацоўваючы і адначасна ўвасабляючы касмічную суцэльнасць [Прохараў 2011, 87]. Аўтар дадзенага артыкула ў цэлым падзяляе гэтае меркаванне.

Удакладніць сэнс знака магла б яго народная назва (калі такая ўвогуле існавала), аднак яна невядомая. Сёння сярод даследчыкаў, краязнаўцаў і аматараў этнічнай культуры распаўсюджаны нефармальныя назвы «парасон» ці «грыб», але яны сучасныя, заснаваныя на графічных аналогіях і не адлюстроўваюць гістарычныя і этнаграфічныя рэаліі.

Адразу зацемім, што «парасон» – гэта асобны знак, які, нягледзячы на графічнае падабенства, не з'яўляецца варыяцыяй хрысціянскага крыжа. На некаторых надмагільных помніках адзначаецца адначасовая прысутнасць знака ў выглядзе шаста з паўсферай і крыжа. Прычым дадзены знак звычайна знаходзіцца над крыжам, што яшчэ раз падкрэслівае, што ён пазначае нябесную сферу і ідэю руху на неба. Трэба таксама адзначыць, што падобнае дубляванне не характэрнае для вясковых надмагілляў: калі прысутнічае крыж, то на помніку ён адзін (выключэнне складае кампазіцыя «Галгофа», на якой прысутнічаюць тры крыжы). Гэта сведчыць пра тое, што насельніцтва адрознівала сэнс і прызначэнне гэтых сімвалаў, што «парасон» адрозніваўся ад крыжа. Падобнае меркаванне таксама выказвалася А. Прохаравым: «…сімвалы суседнічаюць на могілках з хрысціянскай сімволікай – крыжамі, што з'явіліся пазней» [Прохараў 2011, 81]. Больш позняя па паходжанні тыя варыянты «парасона», якія ўключаюць элементы хрысціянскага крыжа (падмурак – «Галгофа», касая перакладзіна).

Амаль усе камяні і каменныя крыжы з выявай гэтага знака з'яўляюцца надмагільнымі, аднак вядомы некаторыя помнікі, якія не адносяцца да гэтай катэгорыі. Гэты знак мы можам убачыць на каменным стодзе, які паходзіць з в. Буцькі Пружанскага р-на. Аднак стод быў знойдзены каля курганных пахаванняў XI ст. на тэрыторыі старых вясковых могілак [Каробушкіна 2009, 134], таму можа быць і так, што знак быў высечаны ў больш позні часы, калі стод сталі выкарыстоўваць у якасці надмагільнага крыжа. Знак, праўда, у гарызантальным становішчы, высечаны на валуне, які знаходзіцца побач са Святым каменем каля в. Крамянец Лагойскага р-на.

Знак разам з іншымі выявамі прысутнічае ў складзе кампазіцый каменнага комплексу каля в. Сцеберакі Вілейскага р-на. Дарэчы, гэта фактычна адзіны выпадак, калі пра камяні з выявамі «парасонаў» было зафіксавана паданне. У народзе распавядаюць, што гэта скамянелы араты з быкамі, які працаваў на Вялікдзень [Культавыя 2011, 63]. Камяні, як і знак, арыентаваны дакладна па лініі поўдзень – поўнач, на Палярную зорка. Археалагічныя раскопкі не выявілі пахаванняў [Прохараў 2011, 82]. Літоўскі даследчык В. Вайткявічус выказваў меркаванне пра тое, што кампазіцыя на валунах (размяшчэнне рогатона адносна іншых знакаў) можа сімвалізаваць змены квадраў Месяца [цыт. па: Прохоров 2003, 116].

Комплекс з сямі камянёў, які таксама ўтрымлівае знак разам з іншымі малюнкамі, знаходзіўся каля в. Стайкі Лагойскага р-на (цяпер у Музеі валуноў у Мінску). Раскопкі не выявілі пахаванняў [Штыхов 1984, 378], але існуе верагоднасць перамяшчэння валуноў з першапачатковага месца. Дадзеныя камяні знаходзіліся на плошчы 20 × 4 м і размяшчаліся без якога-небудзь парадку. Тым не менш форма камянёў сведчыць, што яны павінны былі стаяць вертыкальна, а розныя выяўленыя сюжэты ўскосна паказваюць на верагоднасць іх першапачатковага знаходжання ў пэўным парадку і ўтварэння адзінай кампазіцыі, што назіраецца таксама на Сцебярацкім комплексе. Аднак, акрамя «парасона», на камянях абодвух комплексаў больш няма агульных знакаў, што сведчыць пра розны сэнс (і прызначэнне?) помнікаў.

Знак з антрапаморфнымі абрысамі прысутнічае на каменных жорнах, што ляжаць ля ганку хаты ў в. Лучайка Шаркаўшчынскага р-на. Таксама дадзены сімвал выяўлены на жорнах у в. Вяціцераўка Чашніцкага р-на. У абодвух выпадках прызначэнне жорнаў застаецца невядомым. Адзначым толькі, што жорны нярэдка выкарыстоўваліся ў якасці надмагільных камянёў. Магчыма, што адзначаныя жорны са знакамі таксама маглі быць выраблenымі для гэтых мэтаў, але па нейкіх прычынах на могілкі не трапілі.

Культавую ролю выконвалі петрогліфы на валуне Шчаглец (Щеглец) у Расіі. Каля каменя, на якім маюцца выявы двух «парасонаў», не былі зафіксаваны пахаванні. Падобна, што петрогліфы маюць касмалагічны сэнс, бо прасочваецца сімвалічны падзел на ўзроўні свету, дзе «парасоны» знаходзяцца ў верхняй частцы кампазіцыі. У ваколіцах вв. Муравейна і Красныя Горы Лужскага р-на Ленінградскай вобл. Расіі каля ўваходу ў грот высечаны знак-«парасон» [Мизин 2014, 133]. Пра прызначэнне грота і паходжанне знака нічога невядома.

Варта адзначыць, што гэты знак мае графічнае падабенства з сярэднявечнымі знакамі роду і ўласнасці, але іх трэба адрозніваць. Знакі, падобныя да «парасона», былі выяўлены на цэгле Старога замка ў Гродне [Воронин 1954, 105, мал. 106а]. Падчас раскопак у Ноўгарадзе былі знойдзены ганзейскія рэчы XIV–XV стст. са знакамі ўласнасці [Рыбина 2009, 136, мал. 21–23, 28]. Знакі ўласнасці, вядомыя ў Германіі пад назвай «маркі», выкарыстоўваліся насельніцтвам Паўднёвай Балтыкі нават да XX ст. Да падобнай традыцыі адносяцца і беларускія бортныя знамёны.

Маркі маюць разнастайныя формы, сярод якіх таксама сустракаюцца ў выглядзе восі з трохкутнікам наверсе і яго розныя варыяцыі [Ebbinghaus 1961, 274–277, 279], што нагадваюць беларускія «парасоны». Кожная сям'я мела сваю марку, якая перадавалася ў спадчыну з дадаткам пэўнага новага элемента. Маркі ў Германіі ўжываліся таксама на надмагіллях, прычым назіраецца заканамернасць: просты камень з маркай адлюстроўвае архаічную традыцыю, марка з датай, з датай і імем пазначаюць надмагіллі XVIII–XIX стст. [Ebbinghaus 1961, 283].

Нягледзячы на пэўнае графічнае падабенства некаторых марак з «парасонамі», паміж імі ёсць істотная розніца. Хоць маркі выкарыстоўваліся на над-

магіллях, аднак яны з'яўляюцца сімваламі роду, уласнасці, а не адмысловымі надмагільнымі знакамі (ці шырэй рэлігійнымі / міфалагічнымі); на пахаваннях яны пазначаюць магілу канкрэтнага чалавека, а таму форма не паўтараецца. Знакі ў выглядзе шаста з паўсферай, у адрозненне ад марак, выяўляюць графічнае адзінства і ахопліваюць даволі вялікую тэрыторыю. У сваю чаргу, маркі на адных могілках могуць быць падобнымі, але не аднолькавымі, а кожны від маркі мае абмежаванае лакальнае распаўсюджванне. Гэта выключае магчымасць таго, што знак «парасон» можа адносіцца да знакаў сям'і ці ўласнасці. Тут мы маем справу з паралельным узнікненнем і ненаваннем падобных графічна, але розных па сваім сэнсе сімвалаў.

Пэўныя варыянты «парасона» часам залічваюць да выяваў нейкіх рэальных прадметаў. Напрыклад, знак на камені ў в. Рамашкі Мядзельскага р-на даследчыкі лічаць выявай сярэднявечнага мяча. Камень стаіць на ростанях, побач усталяваны драўляны крыж, і яны разам абнесены плотам. Мясцовыя жыхары не памятаюць, калі і чаму з'явіўся гэты камень [Культавыя 2011, 146].

Разгляданы знак на адным з надмагільных камянёў каля в. Туржэц 2 Полацкага р-на быў палічаны выявай шалома дружынніка. «Пра тое, што на гэтым камені адлюстравана выява менавіта шалома, сведчаць характэрныя дэталі: выцягнутая ўгару форма звона, наяўнасць наносніка і круглых барміц для абароны вушэй, а таксама гэтак званы яблык на шпілі. Такія шаломы яшчэ маглі выкарыстоўвацца ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVI стст.» [Дук 2008, 261–262, мал. 4]. «Характэрныя дэталі» з'яўляюцца элементамі нестандартнай формы знака ў выглядзе шаста з паўсферай. Пра тое, што на могілках каля в. Туржэц 2 мы маем справу менавіта з гэтым знакам, а не з выявай «шалома», сведчаць іншыя камяні з выявай шаста з паўсферай на гэтых могілках, што адзначана ў тым жа артыкуле (аўтар называе яго – «крыж з навершшам», «крыж-сфера») [Дук 2008, мал. 4, 5, 7]. Таксама адзначаецца прысутнасць на тых жа могілках «расколатага ахвярніка», хаця фотаздымак [Дук 2008, мал. 10] сведчыць пра тое, што гэта жорны, якія даволі часта выкарыстоўваліся ў якасці надмагілляў. Версія, што «сяляне разбіралі старыя язычніцкія капішчы» [Дук 2008, 267], камяні з якіх выкарыстоўвалі для надмагілляў, не адпавядае рэчаіснасці.

У еўрапейскіх краінах таксама сустракаюцца старадаўнія надмагіллі з выявамі арбалетаў, некаторыя з якіх у агульных рысах часам падобныя да «парасонаў». Аднак тыя знакі дэтальна паказваюць канструктыўныя элементы арбалета, што не дазваляе іх разглядаць у якасці аналагаў для сімвалаў на беларускіх надмагіллях.

**Храналогія.** Першая спроба вызначыць час з'яўлення знака была зроблена шляхам пошуку камянёў з падобнымі выявамі. У поле зроку даследчыкаў трапіў сакральны камень Шчаглец (Щеглец) у ваколіцах в. Мытна Наўгародскай вобл. Расіі, на якім сапраўды можна пабачыць дзве выявы гэтага знака, якія размяшчаюцца наверсе ўсёй кампазіцыі, што адпавядае меркаванню пра тое, што ён пазначае верхні свет. Паводле А. Формазава, дадзены петрогліф адно-

сіцца да познебронзавага веку – канец II – пачатак I тыс. да н. э. Ён лічыў, што на валуне адлюстравана сонечная калясніца, а «грибовидные и Ф-образные фигуры» – гэта дэталі воза [Формозов 1965, 133, 138]. Тым не менш прыклады петрогліфаў са Швецыі, на якія ён спасылаецца (Рысхед, Дзізазен, Фрэнарп), хоць сапраўды маюць пэўнае падабенства ў некаторых элементах з выявамі на Шчагляцы, тым не менш не ўтрымліваюць менавіта знака ў выглядзе шаста з паўсферай.

Ужо згадвалася меркаванне беларускіх навукоўцаў, што сустракаюцца падобныя наскальныя малюнкі, якія выяўленыя ў Швецыі і датуюцца трэцім тысячагоддзем да нашай эры [Ледавіковыя 1993, 49]. Аднак не называюцца канкрэтныя прыклады. Можна быць упэўненым у тым, яны мелі на ўвазе менавіта прыклады з працы А. Формазава. Можна дапусціць наяўнасць падобнага знака на малюнках бронзавага веку, аднак няма ніякіх падстаў лічыць іх непасрэднымі «продкамі» выяваў на беларускіх камянях. Не прасочваюцца сувязь і пераемнасць з дадзенымі помнікамі з замежных краін.

А. Прохараў выказаў меркаванне, што «пахаванні з выявай шаста з паўколам адносяцца альбо да позняга перыяду існавання каменных магілаў, альбо ўжо да традыцыйных хрысціянскіх пахаванняў, якія замянілі каменныя магілы напрыканцы XVI ст.» [Прохараў 2011, 81]. Сапраўды, археалагічныя крыніцы пацвярджаюць дадзеную версію.

Падчас археалагічных даследаванняў грунтовага могільніка каля в. Доўгае Глыбоцкага р-на быў выяўлены каменны крыж, на якім ёсць знак у выглядзе шаста з паўсферай. Пахаванне, да якога адносіцца крыж, можа быць датавана XV–XVI стст. [Чараўко 2011, 137–139]. На сённяшні дзень гэта старэйшы помнік з выявай названага сімвала. Культавую пляцоўку з валуноў на правым беразе Дняпра за 1 км на поўдзень ад в. Стражава насупраць в. Гацькаўшчына Аршанскага р-на, пад якім былі знойдзены шматлікія чалавечыя косці і кавалкі ганчарнай керамікі, звязваюць з Аршанскай бітвай [Дучыц 2001, 127]. На адным з камянёў быў выяўлены знак у выглядзе восі з паўсферай, які, па ўскосных прыкметах, можна аднесці да XVI ст. Археалагічнае вывучэнне пахавання, маркіраванага каменем з выявай шаста з паўсферай, на могілках каля в. Туржэц 2 Полацкага р-на паказала, што яго можна датаваць пачаткам – першай паловай XVIII ст. [Дук 2008, 266].

Неабходна звярнуць увагу на праваслаўныя цэрквы другой паловы XIX ст., у будаўніцтве якіх выкарыстоўваліся старыя надмагіллі з выявай знака шаста з паўсферай. Так можна даведацца пра ўскосныя даты некаторых камянёў, якія будуць старэйшымі за царкву. Камень з адпаведным знакам знаходзіцца ў сцяне Пакроўскай царквы 1886 г. у в. Беніца Маладзечанскага р-на, а таксама ў сцяне Троіцкай царквы 1860 г. у в. Маркава Маладзечанскага р-на. У агароджы Успенскай царквы (другая палова XIX ст.) у в. Ручыца Вілейскага р-на прысутнічаюць некалькі камянёў з выявай дадзенага знака. У агароджы Пакроўскай царквы 1866 г. у в. Міхневічы Смаргонскага р-на таксама прысутнічаюць падобныя камяні.

У XIX–XX стст. з’яўляюцца надмагіллі, на якіх разам з выявай знака восі з паўсферай прысутнічае дата: в. Золькі Вілейскага р-на (1818 г.), в. Багданава Вілейскага р-на (181? г.), в. Ручыца Вілейскага р-на (1859 г.), в. Астравы Вілейскага р-на (1844 г., 1891? г.), в. Бельнякі Чашніцкага р-на (1849? г., 1882 г.), в. Залеські Глыбоцкага р-на (1869 г.), в. Вялікае Сяло Сенненскага р-на (1895 г.), в. Ігрушка Крупскага р-на (1907 г.), в. Дуброўка Вілейскага р-на (1925 г.), в. Жарсцвянка Барысаўскага р-на (камень са знакам «у нагах», а «ў галаве» – надмагілле з датай «1940 г.»).

Пра верхнюю мяжу існавання традыцыі выкарыстання знака ў выглядзе шаста з паўсферай на сённяшні дзень сведчыць надмагілле з в. Задняя Руднянскага р-на Смаленскай вобл. Расіі, якое ўтрымлівае дату 19 красавіка 1943 г. Па ўсёй верагоднасці, гэтая традыцыя паступова знікае ў міжваенныя часы і перарываецца пасля Вялікай Айчыннай вайны. На яе знікненне маглі паўплываць працэсы калектывізацыі і ўрбанізацыі, змаганне з рэлігіяй у савецкія часы, а таксама знішчэнне вёсак і велізарныя дэмаграфічныя страты ў вайне.

Трэба адзначыць, што на пахаваннях ужо пасляваенных часоў (1950–1970-х гг.) у Барысаўскім (в. Бытча, Студзёнка, Ляхаўка) і Докшыцкім раёнах (в. Асецішча) аўтар сустракаў надмагільныя помнікі, наверсе якіх усталяваны металічны знак у выглядзе «парасона». Магчыма, падобныя помнікі з’яўляюцца працягам традыцыі ставіць надмагільныя камяні з дадзеным знакам.

**Арэал.** Карта распаўсюджвання камянёў з выявай знака шаста з паўсферай створана на падставе аўтарскай базы даных. Звесткі пра камяні са знакамі збіраліся як падчас самастойных экспедыцый аўтара, так і ў архівах іншых даследчыкаў. Камяні з выявамі знака ў выглядзе восі з паўсферай зафіксаваны каля 127 населеных пунктаў, з якіх 121 – з Беларусі, 1 – з Літвы, 5 – з Расіі. Арэал ахоплівае 36 раёнаў Рэспублікі Беларусь. Агульная колькасць улічаных помнікаў – больш за 150. Дакладную лічбу нельга вызначыць па той прычыне, што аўтару часта перадаваліся звесткі аб населеным пункце, дзе ёсць такія камяні, разам са здымкамі аднаго помніка ў якасці прыкладу, але адзначалася, што там ёсць яшчэ некалькі падобных. Сапраўды, дзесьці на могілках можна пабачыць толькі адзін помнік з «парасонам», а дзесьці іх колькасць можа дасягаць васьмі (напрыклад, у в. Ручыца Вілейскага р-на).

На карце пазначаны населеныя пункты, дзе сустракаюцца камяні з усімі варыяцыямі гэтага знака. Нягледзячы на няпоўны тэрытарыяльны ахоп пошукаў падобных валуноў, арэал вымалёўваецца даволі выразна. Найбольшая колькасць зафіксавана ў Крупскім р-не (18 вёсак). На другім месцы – Вілейскі р-н (12). На трэцім месцы – Глыбоцкі і Чашніцкі р-ны (па 10), прычым амаль усе камяні з «парасонамі» з апошняга раёна выяўлены адносна недалёка ад мяжы з Крупшчынай.

Арэал ахоплівае Віцебскую і паўночную частку Мінскай вобл. і памежныя з імі раёны Гродзенскай і Магілёўскай абл. – Валожынскі, Маладзечанскі, Смаргонскі, Мядзельскі р-ны (умоўная лінія Валожын – Смаргонь – возера




Распаўсюджванне камянёў з выявай знака ў выглядзе восі з паўсферай

Свір) – заходняя мяжа арэала. Паўднёвая мяжа праходзіць прыкладна па лініі Валожын – Мінск – Беразіно – Бялынічы. На поўдзень па-за арэалам знаходзяцца 5 вёсак, калі якіх быў зафіксаваны знак. Усходнюю мяжу ўмоўна можна правесці па лініі Орша – Віцебск – Гарадок, але далей на ўсход, на беларуска-расійскім памежжы, вядомы яшчэ 3 вёскі, дзе ёсць камяні з «парасонамі». Цікавай выглядае паўночная мяжа: знакі ў выглядзе шаста з паўсферай даходзяць да Заходняй Дзвіны, на поўнач ад якой вядома толькі 7 вёсак, у тым ліку ў памежных раёнах Пскоўскай вобл. Расіі. Магчыма, што рака з'яўляецца мяжой арэала, аднак тэрыторыя на поўнач ад Заходняй Дзвіны застаецца маладаследаванай, таму падобныя высновы рабіць яшчэ рана, бо для канчатковага адказу пакуль недастаткова інфармацыі.

Таксама цяжка зразумець паходжанне «парасонаў» па-за межамі асноўнага арэала. Ці гэта выпадковасць, якая абумоўлена нейкімі прычынамі, ці сведчанне больш шырокага арэала ў мінулым? Аўтар схіляецца да першай думкі, прынамсі, калі казаць пра помнікі на поўдні і захадзе ад арэала. У выпадку

з помнікамі за паўночнай і ўсходняй межамі больш складана зрабіць нейкія высновы. Таксама трэба адзначыць, што па-за межамі арэала каля аднаго населенага пункта звычайна сустракаецца толькі адзін камень са знакам, у той час як у межах арэала іх колькасць у адным месцы можа быць большай. Між іншым таксама дагэтуль незразумела, чаму на адных могілках «парасоны» ёсць толькі на некаторых надмагіллях і не сустракаюцца на суседніх пахаваннях. Мы не ведаем, ад чаго залежала выкарыстанне дадзенай сімволікі.

Пра што нам гаворыць вызначаны арэал? Паводле наяўных звестак, арэал уваходзіць у межы этнаграфічнай тэрыторыі беларусаў, аднак знак вядомы не паўсюль, таму арэал мае выразны рэгіянальны характар. Арэал строга не адпавядае якому-небудзь з вызначаных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, але асноўная тэрыторыя адпавядае Віцебскаму Падзвінню. Таксама тэрыторыя распаўсюджвання знака не супадае з канфесійным падзелам краіны. Надмагіллі з «парасонамі» прысутнічаюць і на праваслаўных, і на каталіцкіх могілках, што ўскосна можа сведчыць на карысць ранейшага (дахрысціянскага) паходжання знака і яго міфалагічнага сэнсу. Таксама не пацвярджаецца версія пра ўніяцкае паходжанне знака, бо ўніяцтва было распаўсюджана на значна большай тэрыторыі, да таго ж, археалагічна знак фіксуецца яшчэ да заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі.

Вельмі цяжка адказаць на пытанне, чаму гэты знак вядомы на вызначанай тэрыторыі. Неабходнае супастаўленне з іншымі картамі: археалагічнымі, этнаграфічнымі, лінгвістычнымі і т. п. Спакусліва бачыць сувязь з тэрыторыяй рассялення крывічоў-палачанаў і межамі Полацкага княства, з якімі сапраўды назіраецца падабенства. Аднак такую выснову на дадзены момант нельга зрабіць, бо арэал знака, як ужо згадвалася, фактычна спыняецца на Заходняй Дзвіне (пакуль мы не маем неабходных звестак пра наяўнасць / адсутнасць «парасонаў» на правабярэжжы), у той час як межы Полацкага княства пашыраліся да лей на поўнач.

Выказвалася меркаванне, што знак можа быць звязаны з арэалам распаўсюджвання ў Беларусі каменных магіл, якія прынята лічыць пахавальнымі помнікамі яцвягаў [Прохараў 2011, 81], аднак вызначаны намі арэал не пацвярджае «яцвяжскую» версію, бо ён не супадае з рэгіёнам з яцвяжскімі пахаваннямі. Тым не менш унутры культуры каменных магілаў вылучаецца рэгіён (верхняе цячэнне Вяллі, сярэднее цячэнне Бярэзіны і верхняе цячэнне левых прытокаў Заходняй Дзвіны ў раёне Лепельскіх азёраў), які адрозніваецца шчыльным суседствам каменных могільнікаў з курганамі крывічоў [Прохараў 2011, 81]. Гэты рэгіён каменных магілаў (жальнікаў), як няцяжка заўважыць, адпавядае арэалу распаўсюджвання знака ў выглядзе шаста з паўсферай. Важна тое, што вядомы арэал жальнікаў у Беларусі [Дучыц 1996, 42, мал. 1] таксама амаль не заходзіць на поўнач ад Заходняй Дзвіны. Гэтая цікавая акалічнасць прымушае меркаваць, што паходжанне культуры каменных магіл (жальнікаў) і традыцыя выкарыстання «парасона» на гэтай тэрыторыі могуць быць звязаны. Археалагічныя даследаванні некаторых жальнікаў у Беларусі дазваля-




Распаўсюджванне жальнікаў на тэрыторыі Беларусі (паводле Л. Дучыц)

юць датаваць іх XIII–XV стст. [Дучыц 1996, 38–39], пры тым што XV–XVI стст. датуецца самае старое з вядомых надмагілляў з «парасонам». На жаль, дагэтуль у нас няма поўнага разумення паходжання культуры каменных магіл у дадзеным рэгіёне. Калі падсумаваць розныя меркаванні даследчыкаў, то каменныя магілы (жальнікі) з'яўляюцца пераходным этапам ад пахаванняў у курганах да грунтовых магіл. Гэты тып помнікаў характарызуе спалучэнне паганска-хрысціянскіх уяўленняў. З'яўленне жальнікаў можа быць звязана з працэсам змешвання ў гэтым рэгіёне нашчадкаў крывічоў і пэўных груп балцкага насельніцтва, які адбываўся падчас знаходжання Полацкай зямлі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Гэты працэс мог пачацца яшчэ раней, прынамсі, ужо ў XIII ст. уладарамі Полацка з'яўляліся князі літоўскага паходжання. Вось у такіх умовах і мог з'явіцца «парасон», які адлюстроўвае міфалагічныя, рэлігійныя і этнакультурныя асаблівасці развіцця вызначанага рэгіёна. Аднак гэтае пытанне патрабуе далейшага даследавання.

**Тыпы знака** [illegible] іраванні над формамі названага знака дазваляюць сцвярджаць, што асноўнай і, відаць, найбольш архаічнай яго формай з'яўляецца менавіта вось з паўсферай, якая сустракаецца па ўсім арэале. Паводле графічных асаблівасцяў, можна вылучыць наступныя тыпы знака:

1) знак у выглядзе восі з паўсферай;

2) знак у выглядзе шаста з трохкутнікам. Падобная форма знака сустракаецца на адных могілках разам з «класічнай» і таксама размяркоўваецца фактычна па ўсім арэале, але сустракаецца значна радзей;



Камень з выявай каля в. Старыя Шарабаі Глыбоцкага р-на. Фота Максіма Нікіфаровіча



Камень з выявай каля в. Папшычы Глыбоцкага р-на. Фота Мікалая Калантая



Могілкі каля былой в. Шырнавічы Крупскага р-на. Фота Дзмітрыя Скварчэўскага



Камень з выявай каля в. Сцеберакі Вілейскага р-на. Фота Дзмітрыя Скварчэўскага




Могілкі ў в. Студзёнка Барысаўскага р-на. Фота Дз мітрыя Скварчэўскага

3) знак у выглядзе восі з паў сферай на пэўным падму рку;

4) знак у выглядзе шаста з паўсферай з элементамі, якія разам утвараюць антрапаморфныя абрысы;

5) знак у выглядзе шаста з паўсферай з элементамі хрысціянскага крыжа («Галгофа», касая перакладзіна, дадатковая крыжавіна наверсе);

6) знакі з нестандартнымі элементамі, а таксама знакі ў спалучэнні з іншымі, якія ўтвараюць сюжэты і кампазіцыі (як, напрыклад, каля в. Сцеберакі Вілейскага р-на ці в. Стайкі Лагойскага р-на і інш.). Пераважная большасць такіх знакаў мае ўнікальны характар і не паўтараецца ў іншых мясцінах.

Тыпы 3–5 маюць падабенства, а прыналежнасць да таго ці іншага тыпу часам умоўная, яе можна інтэрпрэтаваць па-рознаму. Магчыма, гэтыя тыпы адлюстроўваюць працэс змены ўяўленняў пра знак і яго паступовае атаясамленне з крыжом. Яны дэманструюць пераходныя формы ад класічнага «парасона» да хрысціянскага крыжа на надмагіллі.

Разгляд кампазіцый, у склад якіх уваходзяць «парасоны», пакінем па-за межамі дадзенага артыкула. Гэта асобная тэма для даследавання. Адзначым толькі, што назіраюцца спалучэнні са знакамі, якія можна інтэрпрэтаваць як зорку ці салярны сімвал. Нярэдка сустракаецца знак у выглядзе восі, якая злучае тры паўсферы, што можа быць адлюстраваннем трохчасткавай мадэлі Сусвету. Вядома выява, дзе асобныя меншыя «парасоны» нібыта вырастаюць з аднаго вялікага, а сама фігура мае крыжападобную форму ды нагадвае дрэва. Такія кампазіцыі таксама ўмоўна можна назваць «Сусветным дрэвам», што адпавядае агульнаму сэнсу знака.

**Папярэднія высновы.** Паводле атрыманых звестак, традыцыя вырабу каменных надмагілляў з выявай знака ў выглядзе восі з паўсферай існавала ў перыяд з XV–XVI стст. да 40-х гадоў XX ст.:

a) традыцыя выкарыстання знака мае выразны рэгіянальны х арактар. Вызначаны арэал можа быць звязаны з пахавальнай трад ыцыяй каменных магі л (жальнікаў) Полацкай зямлі ці ў вогуле з пахава льнымі традыцыя мі крывічоў-палачанаў і іх нашчадкаў. Магчыма, знак з’яўляецца прыкметай асаблівасці этнакультурнага развіцця на балта-славянскім памежжы;

b) выкарыстанне знака на надмагіллях, а таксама выпадкі яго прысутнасці на сакральных кам янях сведчыць пра тое, што ён адлюстроўвае міфалагічныя і рэлігійныя ўяўленні насельніцтва вызначанага рэгіёна. Гэты знак мае дахрысціянскія карані, з’яўляцца вынікам развіцця паганскіх уяўленняў, сведчаннем узаемадзеяння язычніцкіх і хрысціянскіх вераванняў;

c) Гэты знак не з’яўляецца варыянтам хрысціянскага крыжа, мае самастойнае паходжанне, можа пазначаць «Вось Сусвету», а некаторыя яго варыяцыі могуць апісваць складаныя касмалагічныя сюжэты.

**Перспектывы даследавання.** Неабходна працягваць прац у па пошуку новых камянёў з выявамі «парасонаў». Наступныя пошукі, безумоўна, могуць удакладніць арэал. Асабліва перспектыўныя для пошукаў раёны Віцебскай вобл. Таксама варта было б удакладніць распаўсюджванне на тэрыторыі Літвы,

Латвіі і Пскоўскай і Смаленскай абл. Расіі, бо ў наяўнасці малая колькасць звестак па гэтых тэрыторыях.

Варта звярнуць у вагу на такую з’яву, як драўляныя прыдарожныя крыжы, якія завяршаюцца паўсферай (фактычна той жа самы «парасон»), якія сустракаюцца ў Маладзечанскім (в. Беніца, Рэдзькі) і Ашмянскім (в. Карабы, Міхайлоўшчына, Цюпішкі) р-нах. Было б цікава ўдакладніць іх геаграфію і суаднесці з арэалам камянёў з «парасонамі». Таксама ўжо згадваліся надмагіллі з усталяванымі металічнымі «парасонамі», тэрыторыю распаўсюджвання якіх таксама варта было б вызначыць. Яшчэ раней А. Прохараў звяртаў увагу на металічныя каталіцкія крыжы, якія наверсе ўтвараюць паўкола-сферу [Прохараў 2011, 86–87]. Усе пералічаныя помнікі вартыя даследавання, што можа дапамагчы ў пытаннях вызначэння паходжання знака ў выглядзе восі з паўсферай, яго дакладнага арэала, магчымай пераемнасці традыцыі крыжоў падобнай формы ад камянёў з «парасонамі». Важна тое, што гэтыя помнікі ўсё яшчэ з’яўляюцца рэаліямі сучаснай вёскі, што робіць магчымым атрымаць новую інфармацыю пра гэты сімвал.

Апытанні вяскоўцаў пра надмагіллі з «парасонамі» застаюцца актуальным напрамкам даследавання. Хочацца спадзявацца, што нейкую інфармацыю яшчэ магчыма зафіксаваць. Найперш цікавіць, як вяскоўцы называюць гэты знак, што ён значыць, чаму яго высякалі.

Перспектыўным з’яўляецца і археалагічнае вывучэнне пахаванняў з «парасонамі» на надмагіллях і жальніках, што дазваляе ўдакладніць не толькі храналагічныя межы выкарыстання знака, але і этнакультурныя асаблівасці пахавальнай традыцыі.

**Падзяка** Аўтар выказвае вялікую ўдзячнасць усім, хто дапамагаў у пошуках і падрыхтоўцы артыкула. Асабіста хачу выказаць падзяку за дапамогу: Аляксею Лужынскаму, Аляксею Глушко і Студэнцкаму этнаграфічнаму таварыству, Яўгену Барышнікаву, Уладзіміру Лобачу, Таццяне Валодзінай, Вользе Лабачэўскай, Андрэю Прохараву, Яўгену Уласаўцу, Цімафею Авіліну, Аляксею Дзерманту, Барысу Шчуко, Максіму Нікіфаровічу, Сяргею Лескецю, Ільі Бутаву, Віктару Чараўко, Валеру Арцюховічу. Выбачаюся, калі выпадкова кагосьці не згадаў.

## Літаратура

Воронин 1954 – Воронин, Н. Н. Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932 – 1949 гг.) / Н. Н. Воронин. – М. : Изд-во Акад. Наук СССР, 1954. – 237 с.

Дук 2008 – Дук, Д. У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2008. – Вып. 15. – С. 261–285.

Дучыц 1996 – Дучыц, Л. У. Курганна-жальнічныя могільнікі на тэрыторыі Полацкай зямлі (да пастаноўкі пытання) / Л. У. Дучыц // Гіст.-археал. зб. – 1996. – № 10. – С. 38–42.

Дучыц 2001 – Дучыц, Л. У. Вясковыя могільнікі. Агульная характарыстыка. Тыпалогія пахаванняў / Л. У. Дучыц // Археалогія Беларусі. – Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – С. 124–129.

Каробушкіна 2009 – Каробушкіна, Т. Н. Буцькі / Т. Н. Каробушкіна // Археалогія Беларусі: у 2 т. – Т. 1. – Мінск, 2009. – С. 134.

Культавыя 2011 – Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі / [А. К. Карабанаў і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т прыродакарыстання. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 234 с.

Ледавіковыя 1993 – Ледавіковыя валуны Беларусі: Эксперыментальная база вывучэння валуноў / АН Беларусі, Ін-т геалогіі, геахіміі і геафізікі; С. Д. Астапава, У. Я. Бардон, М. А. Вальчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 159 с.

Ляўкоў 1992 – Ляўкоў, Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. А. Ляўкоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.

Мизин 2014 – Мизин, В. Культовые камни и сакральные места / В. Мизин. – СПб. : Центр сохранения культурного наследия, 2014. – 240 с.

Прохоров 2004 – Прохоров, А.А. О камнях у деревни Стебераки / А. А. Прохоров // Культурны ландшафт Вілейшчыны: матэрыялы Вілейскай рэгіян. навук.-практ. канф., 26–27 ліп. 2003 г. – Мінск, 2004. – С. 108–117.

Прохараў 2011 – Прохараў, А. А. Каменны шлях на нябёсы. Міфа-рытуальная семантыка пахавальнага знака з паўночнай Беларусі / А. А. Прохараў // Druvis. – 2011. – № 3. – С. 81–87.

Рыбина 2009 – Рыбина, Е. А. Новгород и Ганза / Е. А. Рыбина. – М. : Рукописные памятники Древней Руси, 2009. – 320 с.

Формозов 1965 – Формозов, А. А. Камень «Щеглец» близ Новгорода и камни-“следовики” / А. А. Формозов // Советская этнография. – 1965. – № 5. – С. 130–138.

Чараўко 2011 – Чараўко, В. У. Археалагічныя разведкі на грунтовым могільніку каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна ў 2010 г. / В. У. Чараўко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. пр. Міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. Ч. 1 / пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – С. 130–134.

Штыхов 1084 – Штыхов, Г.В. Исследования в окрестностях Минска, Борисова, Логойска / Г. В. Штыхов // Археологические открытия 1982 г. – М.: Наука, 1984. – С. 377–378.

Ebbinghaus – Ebbinghaus, K. Die Hausmarken auf Hiddensee / K. Ebbinghaus // Die Fischerkommünen auf Rügen und Hiddensee. – Berlin : Akademie-Verlag, 1961. – P. 273–295.

Matulis – Matulis, R. Istoriniai akmenys / R. Matulis. – Vilnius, 1990. – 143 p.

Prokhorov 2007 – Prokhorov, A. A. Grave Symbol in North-West Belarus / A. A. Prokhorov // Holy Groves around the Baltic Sea. Abstracts. – Tartu, May 4–6, 2007. – P. 7–8.

Prokhorov 2008 – Prokhorov, A. Images on the stones at Scebiaraky village in North-West Belarus / A. Prokhorov // Astronomy and Cosmology in Folk Traditions and Cultural Heritage / Edited by J. Vaiskunas. – Klaipėda : Klaipėda University Press, 2008. – P. 163–169.

Prohorovs 2008 – Prohorovs, A. Attēli uz akmeņiem Scebiaraky ciemā ziemeļrietumu Baltkrievijā / A. Prohorovs // Zvaigžņotā debess. 2008 Gada pavasaris (199). – P. 29–35.

Prokhorov 2009 – Prokhorov, A. On a Grave Symbol from Northwest Belarus [Electronic resource] / A. Prokhorov // Folklore. Electronic Journal of Folklore. – 2009. – Vol. 42. – Mode of access: http://www.folklore.ee/folklore/vol42/prokhorov.pdf. – Date of access: 02.02.2016.

*ДМИТРИЙ СКВОРЧЕВСКИЙ*

## КАМНИ С ИЗОБРАЖЕНИЕМ ЗНАКА В ВИДЕ ОСИ С ПОЛУСФЕРОЙ: К ПРОБЛЕМЕ ПРОИСХОЖДЕНИЯ, АРЕАЛА, КЛАССИФИКАЦИИ И ДАТИРОВКИ

Статья посвящена изучению камней с изображением знака в виде шеста с полусферой наверху и его вариациями, которые составляют отдельную группу памятников. Замечено, что данный знак известен преимущественно на надгробиях, однако известны случаи его использования на камнях несвязанных с погребальными традициями.

Установлено, что: a) традиция изготовления каменных надгробий с изображением знака в виде оси с полусферой существовала в период с XV/XVI в. до 40-х гг. XX в.; b) использование знака имеет четкий региональный характер. Установленный ареал может быть связан с погребальной традицией каменных могил (жальников) Полоцкой земли или, в общем, с погребальными традициями кривичей-полочан и их потомков. Возможно, данный знак явля-

ется признаком особенности этнокультурного развития на балто-славянском пограничье; c) использование знака на надгробиях, а также случаи его присутствия на сакральных камнях свидетельствует о том, что он отражает мифологические и религиозные представления населения установленного региона. Данный знак имеет дохристианские корни, является результатом развития языческих представлений, свидетельством взаимодействия языческих и христианских верований; d) этот знак не является вариантом христианского креста, имеет самостоятельное происхождение, может обозначать «Ось Мира», а некоторые его вариации могут описывать сложные космологические сюжеты.

Ключевые слова: надгробия, сакральные камни, погребальная символика, погребальный обряд, жальники, Полоцкое княжество.

*DZMITRY SKVARCHEUSKI*

**STONES WITH THE IMAGE OF A POLE WITH A SEMICIRCLE: THE PROBLEMS OF ORIGIN, AREA, CLASSIFICATION AND DATING**

This article is about stones with images containing the symbol of a pole with a semicircle. This symbol had a cosmological meaning and represented world axis and heavenly sphere. The author considers the problem of attribution of the sign: area, chronology, meaning, and typology. According to the information received, the tradition of using tombstones with symbol of a pole with a semicircle existed from the 15th/16th centuries to the 1940-ies. It was the regional tradition. Area of the tombstones with this sign may be associated with the medieval burial tradition of stone tombs («zhalniki») in the Duchy of Polotsk. The tradition of using tombstones with symbol of a pole with a semicircle may be associated with funeral rites of Krivichy and their descendants. Perhaps this symbol is a sign of particular ethnic and cultural development in the Balto-Slavic contact zone. The symbol of a pole with a semicircle reflects the mythological and religious ideas of the population of a defined region. This sign had roots in the pagan ideas and it is a result of interaction between the pagan and christian beliefs.

*Keywords:* gravestones, sacred stones, funerary symbolism, funeral rite, culture of stone tombs, the Principality of Polack.

Пастyпiў у рэдакцыю *01.03.2016; zmicerbelapol@inbox.ru*